# Лініі дабра

**Такую назву атрымала дабрачынная экспазіцыя графікі маладых мастакоў, якая з 14 студзеня і да канца месяца працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы ў галерэі “Панарама”.**

Мастацкі праект накіраваны на аказанне дапамогі дзецям-сіротам, якія маюць сур’ёзныя праблемы са здароўем. Выстава “Лініі дабра”, як паведаміла менеджар па маркетынгу і сувязях з грамадскасцю фонду дапамогі дзецям “Белы бусел” Любоў Стрыга, была заснавана і праводзіцца для таго, каб нагадаць пра дзетак з інтэрнатаў, якія маюць патрэбу ў дапамозе.

“Нашымі партнёрамі сталі Нацыянальная бібліятэка, фонд дапамогі дзецям “Белы бусел”, дабрачынная група “Добрыя сэрцы” і Мінскі мастацкі каледж імя А.К.Глебава”, — расказала Л.Стрыга.

Мастакі, якія захацелі паўдзельнічаць у праекце, праз выяўленчае мастацтва імкнуцца быць карыснымі, дапамагаць тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Частка сродкаў, выручаных ад продажу білетаў, пойдзе на дапамогу падшэфным дзіцячым установам “Белага бусла”.

Праект “Лініі дабра” — цікавая грамадская ініцыятыва, якая ўяўляе сабой графічныя замалёўкі беларускай традыцыйнай культуры, фальклору, нацыянальных арнаментаў, гарадскіх пейзажаў, а таксама рэлігійныя матывы, філасофскія роздумы, што ствараюць стрыманы вобраз сучаснай творчай штодзённасці маладога мастака.

Работы маладых творцаў, вучняў і выпускнікоў мастацкага каледжа імя А.К.Глебава і віцебскіх УВА ўпрыгожылі хол галерэі “Панарама” ў Нацыянальнай бібліятэцы, дзе праходзіць акцыя. Дарэчы, у канцы месяца, калі творчы праект завершыцца, на інтэрнэт-платформе пройдзе анлайн-аўкцыён экспануемых работ.

Са слоў прадстаўніка фонду, экспазіцыя будзе доўжыцца да канца студзеня. Але, магчыма, тэрміны яе правядзення будуць працягнуты. Што датычыцца кошту білета, то ў яго ўваходзіць і наведванне агляднай пляцоўкі бібліятэкі.

Што тычыцца дзейнасці фонду “Белы бусел”, то яна накіравана на вырашэнне праблем асаблівых дзяцей, якія знаходзяцца на выхаванні ў інтэрнатах краіны. Арганізацыя займаецца валанцёрскай і фінансавай дапамогай падшэфным дзіцячым дамам і спецыялізаваным установам, такім як РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, Беларускаму дзіцячаму хоспісу, Навагрудскай школе-інтэрнату для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, Асіповіцкай школе-інтэрнату для дзяцей з праблемамі апорна-рухальнага апарату, ЦКРНіР Навагрудскага раёна і інш.

Увогуле, “Лініі дабра” — праект, які спадабаецца ўсім, хто цікавіцца культурай, гісторыяй і хоча быць карысным для тых, хто мае патрэбу ў дапамозе. У фондзе “Белы бусел” заўважылі, што гэтая мастацкая ініцыятыва для тых, хто хоча дапамагаць, умее спачуваць. А выяўленчае мастацтва, праз якое прэзентуецца сацыяльны праект, — добры сродак самарэалізацыі і самавыяўлення, а таксама выразны спосаб прыцягнуць увагу да дзейнасці дабрачынных фондаў, зацікавіць самую розную аўдыторыю.

“Падчас зімовых свят, калі цуд становіцца цалкам рэальнай справай, лініямі ад сэрца да сэрца аўтары імкнуцца пашырыць межы гаючага мастацкага ўплыву: прынесці цяпло і клопат тым, каму іх не хапае, здзейсніць тое, што загадана, падказаць, каму можна і неабходна дапамагчы менавіта сёння”, — сказала прадстаўнік “Белага бусла”. — Дарэчы, наш творчы праект не толькі заклікае да дапамогі. Ён праводзіцца яшчэ і для таго, каб нагадаць пра дзейнасць беларускіх дабрачынных фондаў і арганізацый, матываваць да ўдзелу мецэнатаў і валанцёраў і падтрымаць маладых таленавітых мастакоў, якія не застаюцца абыякавымі да сацыяльных праблем”.

**Наталля САХНО.**
*natallia.sakhno@nastgaz.by*